ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
30 01 2014 г.

МАЛЮЮ — ЗНАЧЫЦЬ ЖЫВУ!

У сярэдняй школе № 14 г. Наваполацка прайшла першая выстава карцін выпускніцы мастацкай школы імя І. Ф. Хруцкага Вольгі Краўчанкі. Там былі прадстаўлены дзевяць лепшых карцін, намаляваных дзяўчынай на працягу пяці гадоў навучання ў мастацкай школе. На гэтым невялікім, але значным для Вольгі мерапрыемстве прысутнічалі яе бацькі, настаўнікі і лепшыя сябры. У адрас маладога аўтара цудоўных карцін было сказана шмат цёплых слоў.

Безумоўна, Бог надзяліў гэтую светлую дзяўчынку талентам. Яшчэ ў дзіцячым садку Волечка з радасцю выконвала просьбы выхавальнікаў і стварала няпростыя для дзіцяці малюнкі. Малявала, дарэчы, не горш за саміх выхавальнікаў.

Па патрабаванні першай настаўніцы Любові Іванаўны Дуднічэнкі ў 11 гадоў Вольга падала дакументы ў мастацкую школу і паспяхова здала экзамены. Выкладчыкі адгукаюцца аб Вользе як аб стараннай і мэтанакіраванай вучаніцы. Дзяўчына — увасабленне сваёй дыпломнай працы, лялькі «Анёл-натхняльнік», за якую яна, дарэчы, атрымала 10 балаў. Гэтая лялька месяц цешыла вочы наведвальнікаў выставачнай залы гарадской бібліятэкі імя У. У. Маякоўскага. «Мой дыпломны праект быў вельмі карпатлівым, — прызнаецца Вольга, — я вельмі старалася, бо разумела, што гэта — вынік усёй працы за час навучання ў мастацкай школе».

Вольга — не толькі таленавітая мастачка, але яшчэ і добрая вучаніца. Гэта надзвычай таленавіты і творчы чалавек. Яна цікавіцца нацыянальнай культурай і беларускай мовай. Дзяўчына чуйная да паэтычнага слова і вобразаў, любіць наведваць тэатр і розныя выставы ў музеях. Яна старанная, адказная, добразычлівая. Вольгу паважаюць і любяць аднакласнікі і настаўнікі-прадметнікі, — кажа класны кіраўнік Ірына Ахмедаўна Мятлюк. — Яшчэ яна заўсёды выконвае ўсе творчыя заданні ў школе, а на перапынках не губляе часу дарма: малюе партрэты аднакласнікаў».

У летні час, калі няма заняткаў у школе, Вольга займаецца спортам. Кожны вечар яна выходзіць на пяцікіламетровыя прабежкі. А калі надвор'е не спрыяе, замяняе бег спартыўнай хадзьбой. «Кожны чалавек павінен прысвячаць частку свайго часу спорту. Я ўжо даўно адмовілася ад грамадскага транспарту і амаль заўсёды перасоўваюся пешшу. Лічу, што хадзьба карысная для здароўя і фігуры». Калі выпадае вольны дзянёк, Вольга адпраўляецца на трэніроўку па валейболе.

Такой разнастайнай паўстала перад намі Вольга Краўчанка. Гэтая разумная, творчая, спагадлівая, спартыўная і пазітыўная дзяўчына можа паслужыць выдатным прыкладам для многіх, хто яшчэ не знайшоў сваё месца ў жыцці, не заўважыў у сабе прыродныя таленты. Вольга развівае ўсе свае здольнасці і навыкі і не спыняецца на дасягнутым. «Дасканаласці няма мяжы», — лічыць яна і жыве актыўна і насычана.

Сваю будучую прафесію Вольга хоча звязаць з мастацтвам. Вырашыла вучыцца на дызайнера. Нам застаецца пажадаць гэтай таленавітай дзяўчыне творчага натхнення, паспяховага паступлення і шмат новых асабістых выстаў, якія будуць заўважаны мастацкімі крытыкамі.

Лізавета МАЙСЯЁНАК,
вучаніца 11 класа сярэдняй школы № 14
г. Наваполацка.

ПРА АЎТАРА

Лізавеце 16 гадоў. Гаворачы пра сябе, дзяўчына была не шматслоўнай. Але, з іншага боку, у некалькіх фразах паведаміла шмат цікавай інфармацыі. Паслухаем?

— Да 9 класа займалася танцамі, музыкай і сальфеджыа. Ужо даўно прытрымліваюся правілаў здаровага ладу жыцця, — распавяла Лізавета. — Я вельмі люблю спорт. Займаюся лёгкай атлетыкай, раней займалася валейболам. Цяпер выступаю за школьную каманду па баскетболе. Я вялікая «фанатка» футбола. У вольны час люблю пачытаць. Часам пішу вершы. Па жыцці я — аптыміст.

СВЯТЛО ПАМЯЦІ ПАЛЕСКАГА МАРЭСЬЕВА

Сцежкі, шляхі, дарогі… Іх так многа на нашай зямлі. Людзі самі выбіраюць, на якую дарогу ступіць і чым кіравацца ў гэтым жыцці. «Жыццё пражыць — не поле перайсці», — сцвярджае народная мудрасць. Гэта мудрасць мільёнаў людзей, якія прайшлі праз мноства выпрабаванняў на сваім шляху.

Нялёгкім быў шлях і майго дзядулі Паўла Ігнацьевіча Канопліча, чалавека, які прысвяціў усё сваё жыццё людзям. «Палескі Марэсьеў» — менавіта так называюць дзядулю на радзіме.

Родам ён з вёскі Замошша Лельчыцкага раёна, з сялянскай сям'і. З самага маленства дапамагаў бацькам, быў пастухом. Скончыў тры класы мясцовай школы.

Працаваць пачаў у 1935 годзе ў калгасе «Перамога» пасля заканчэння курсаў трактарыстаў пры Лельчыцкай МТС. Дзядуля неаднаразова казаў нам, што ён з вялікай радасцю і задавальненнем набываў гэтую прафесію.

Затым яго прызвалі на службу ў армію. Удзельнічаў у вайне з белафінамі, вызваляў Заходнюю Беларусь і Украіну ад панскай Польшчы. У гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў у партызанскім атрадзе імя Калініна Лельчыцкай партызанскай брыгады.

Дзень 10 красавіка 1944 года стаў самым страшным і жудасным для дзядулі. Ідучы на заданне ў складзе партызанскай разведкі, непадалёку ад роднай вёскі ён падарваўся на міне. Яму ампутавалі ступні абедзвюх ног. Больш за год урачы змагаліся за яго жыццё. Горкім было вяртанне дадому інваліда І групы ў няпоўныя 30 гадоў.

Напачатку дзядулю здавалася, што ўсё ўжо страчана, што ніколі ён не будзе займацца сваёй любімай справай. Аднак паверыць у сябе і свае сілы дапамаглі людзі. Падтрымала ў цяжкія хвіліны і любімая дзяўчына, мая бабуля.

Як чалавек моцнай волі і мужнасці, мой дзядуля не спалохаўся цяжкасцяў. Прачытаўшы кнігу Барыса Палявога «Аповесць пра сапраўднага чалавека», у думках ён уявіў сабе вобраз Аляксея Марэсьева. І дзякуючы ўпартым намаганням у 1947 годзе дзядуля зноў сеў за руль трактара і працаваў механізатарам аж да самага выхаду на заслужаны адпачынак.

Радзіма высока ацаніла яго заслугі. За дасягнутыя поспехі ў 1966 годзе дзядулі было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Залатая Зорка». Ён таксама ўзнагароджаны медалямі «20 гадоў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», «30 гадоў Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», «60 гадоў Узброеных Сіл СССР».

Дзядуля прымаў актыўны ўдзел і ў грамадскім жыцці: выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, членам райкама КПБ, дэпутатам раённага і сельскага Саветаў народных дэпутатаў. Ён заўсёды карыстаўся вялікім аўтарытэтам і павагай сярод землякоў. Менавіта такім нялёгкім быў жыццёвы шлях палескага Марэсьева.

Згадваючы пра дзядулю, мае родзічы не раз падкрэслівалі, што ён заўсёды вучыў іх быць сумленнымі, чулымі, працавітымі, адказна ставіцца да сваёй справы. Такімі мы і імкнёмся быць.

Правільна гавораць, што кожны — гаспадар свайго лёсу. І жыццё майго дзядулі — яскравае таму пацвярджэнне. Як ні цяжка было яму, аднак ён прайшоў свой зямны шлях годна і з узнятай галавой.

Жыццё яго — яркае святло. Таму мой абавязак на зямлі — працягнуць добрыя справы дзядулі. Праляцяць гады, многае забудзецца, але я спадзяюся, што свечка памяці, запаленая ў сэрцах людзей, не згасне ніколі.

Павел КАНОПЛІЧ, вучань 8 класа
Замошскай базавай школы
Лельчыцкага раёна.

ПРА АЎТАРА

Паўлу 13 гадоў, пакуль ён — самы юны па ўзросце ўдзельнік конкурсу. Пра сябе хлопец напісаў, што цікавіцца гісторыяй свайго краю. «З'яўляючыся экскурсаводам школьнага краязнаўчага музея, прымаю актыўны ўдзел у аднаўленні і захаванні імёнаў і гістарычных здзяйсненняў людзей, што праславілі наш край сваёй баявой, творчай і прафесійнай дзейнасцю». Цікавая інфармацыя, але, пагадзіцеся, гучыць неяк афіцыйна, праўда?

Калі мы патэлефанавалі Паўлу, той быў больш гаваркім. Распавёў, што ў школе яшчэ наведвае гурток «Майстар», дзе вучыцца вырабляць розныя рэчы сваімі рукамі з драўніны. Чытаць, паводле яго слоў, любіць Пушкіна. Сям'я мае гаспадарку — карову, свіней, сабаку, кошку, Павел дапамагае бацькам з усім гэтым спраўляцца. Умее і карову падаіць, і свіней пакарміць. Кажа, што па вясне вельмі любіць ездзіць па бярозавік. А пакуль хацеў бы стаць… Кім бы вы думалі? Дальнабойшчыкам! А таму цікавіцца яшчэ і аўтамабілямі.

МАГІЯ ГУКАЎ АД МАРКА

Музыка адчыняе чалавеку дзверы ў іншы свет, у якім можна абысціся без слоў: тут пануюць гукі. Музыка гучыць унутры нас… Мелодыя, тэмбр — у сэрцы кожнага яны свае, асаблівыя і непаўторныя. Пісаць музыку могуць толькі чулыя і глыбокія людзі, здольныя выказаць свае эмоцыі, думкі з дапамогай гукаў. Мелодыю, якая іграе ў іх сэрцы, яны могуць запісаць на паперы і тым самым даць магчымасць свету яе пачуць. А гэта — як упусціць кагосьці ў сваю душу.

Я хачу расказаць пра школьніка, пра звычайнага шаснаццацігадовага хлопца і па «сумяшчальніцтве» маладога кампазітара з Наваполацка, Марка Сяргеева.

— Музыкай я захапляюся гадоў з пяці, але пісаць яе пачаў толькі год-паўтара таму, — распавядае Марк. — Для мяне музыка — гэта яшчэ адзін спосаб, які дазваляе людзям адчуваць эмоцыі. Раней я хадзіў у музычную школу, але праз два гады перастаў. Ідэя напісаць свой твор узнікла яшчэ да з'яўлення майго цяперашняга сінтэзатара, калі ў мяне быў дзіцячы, цацачны, на тры актавы. Але для асноўнай мелодыі гэтага хапала.

— Што натхняе цябе на напісанне музыкі?

— Крыніц натхнення як такіх няма. Для таго, каб штосьці напісаць, мне трэба сесці за музычны інструмент і трохі падумаць, што я чакаю ад той ці іншай мелодыі. Перавагу аддаю інструментальным жанрам. Але ў мяне ёсць некалькі незапісаных песень у стылі «поп-панк».

— Ты як кампазітар імкнешся да прызнання ці пішаш больш для сябе?

— Пішу для сябе і для людзей. Вядома, прыемна, калі ў тваёй творчасці ёсць шмат прыхільнікаў, але падобным пакуль што я пахваліцца не магу. Хоць і ў мяне ёсць сталыя слухачы. Галоўным чынам, гэта людзі, з якімі я працую, мае сябры, бацькі, ну і трохі прыхільнікаў на сайце PromoDj. Музыку я запісваю дома, самастойна. Праўда, калі мне раптам спатрэбіцца гітарная партыя, я звяртаюся да сябра.

— Як да твайго захаплення ставяцца бацькі і сябры?

— Сябры падтрымліваюць, а бацькі спачатку лічылі яго чарговым мімалётным хобі, але цяпер іх меркаванне змянілася. Ды і сам я паступова стаўлюся да свайго захаплення ўсё больш сур'ёзна, настолькі, каб думаць пра яго як пра сваю будучую кар'еру. Бо менавіта да гэтага ляжыць мая душа.

— Ці спрабаваў ты пісаць тэксты песень?

— Так. Вакалістка з Расіі Ганна Ярохіна цяпер працуе над вымаўленнем англійскай для запісу вакалу да майго трэка пад назвай Temporal rain.

— Якія творчыя планы на будучыню?

— Дапісаць саўндтрэк да вэб-серыяла знаёмага з Йашкар-Алы. Хачу зняць і свой вэб-серыял, але гэта больш аддаленая будучыня.

— Якія ў цябе любімыя музычныя групы, спевакі?

— О, іх тысячы! Мюрэй Голд, Браян Тайлер, Дэні Элфман, Two Steps from hell, яшчэ слухаю амерыканскую класіку кантры і блюзу ў асобе Джоні Кэша і Лайтніна Хопкінса. Я наогул меламан.

— Хто твой галоўны крытык?

— Верагодна, я сам. Але калі мне патрабуецца нечае аўтарытэтнае меркаванне, то я звяртаюся да сваёй сяброўкі з Самары. Яна сама піша музыку, і ў гэтай справе ў яе больш досведу.



— Калі б ты злавіў залатую рыбку, то якія тры жаданні загадаў бы?

— Першае жаданне — бясконцая колькасць жаданняў, другое — пісьмовае пацвярджэнне на кожнае маё загаданае жаданне з апісаннем дакладных наступстваў. Ну, а потым — жыць прыпяваючы.

…Цяжка ўявіць наша жыццё без музыкі. Як казаў старажытны грэчаскі філосаф Платон: «Музыка натхняе ўвесь сусвет, забяспечвае душу крыламі, спрыяе палёту ўяўлення; музыка надае жыццё і весялосць усяму існуючаму… Яе можна назваць увасабленнем усяго прыгожага і ўсяго ўзнёслага».

Арына КАГАЛЁНАК,
вучаніца 10 класа гімназіі № 2
г. Наваполацка.
Фота аўтара.

ПРА АЎТАРА

Арына — адзін з пастаянных і актыўных аўтараў «Чырвонкі»: супрацоўнічае з рэдакцыяй ужо каля года, дасылаючы свае «пробы пяра» ў розных жанрах. Дарэчы, дзяўчына ўжо ўдзельнічала ў папярэднім творчым конкурсе для юных няштатнікаў.

Арыне 16 гадоў. Пра сябе яна кажа наступнае:

— За мінулы час я паспяхова здала іспыты і цяпер вучуся ў 10 класе фізіка-матэматычнага профілю. Журналістыкай займаюся ўжо трэці год. У вольны час люблю падарожнічаць, фатаграфаваць, маляваць, слухаць розную музыку і чытаць. Мая галоўная мэта — паступіць у наступным годзе ва ўніверсітэт. А зараз я проста жадаю, каб творчае натхненне ніколі не заканчвалася, а кожны дзень дазваляў мне пазнаваць нешта новае!